Дзеля памяці

# «КОЖНЫ ДЗЕНЬ ЗЯМЛЯ ВЫДАВАЛА НОВЫХ АХВЯР...»

## У Гродзенскай вобласці пошук загінулых байцоў вялі па нямецкіх фотаздымках

**Беларускія пошукавікі знайшлі каштоўныя здымкі на архіўным інтэрнэт-аўкцыёне роўна год таму. Гэта кадры першых тыдняў вайны, калі савецкія войскі з вялікімі стратамі адступалі пад націскам ворага. Як відаць, немцы любілі здымаць сваіх салдат на жудасным фоне. Вядома, былы ваенны ландшафт значна змяніўся, па-іншаму выглядае мясцовасць. Але ўдзельнікі міжнароднай пошукавай Вахты Памяці змаглі па тых ці іншых дэталях знайсці масавыя месцы пахавання савецкіх вайскоўцаў і мірных жыхароў.**

### У ПОШУКАХ РАЗГРОМЛЕНАЙ КАЛОНЫ

Патрыятычная акцыя «Беларусь памятае: эстафета Памяці» доўжыцца не адзін год і аб'ядноўвае пошукавыя атрады Беларусі і Расіі. На раскопкі ў нашу краіну прыязджаюць прадстаўнікі Масквы, Валагодскай, Архангельскай і Свярдлоўскай абласцей, Удмуртыі, Татарстана. Арганізатары акцыі — 52-і асобны спецыялізаваны пошукавы батальён Узброеных Сіл Беларусі пры ўдзеле пошукавай групы «Бацькаўшчына». Мэта адна: падняць астанкі загінулых воінаў і па магчымасці знайсці іх імёны. Чарговы, чацвёрты, этап завяршыўся на мінулым тыдні. Месцам правядзення раскопак сталі Слонімскі, Зэльвенскі і Свіслацкі раёны.

Як кажа **намеснік камандзіра 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Узброеных Сіл Аляксандр КРЭМЯНЕЎСКІ**, работа вялася на працягу тыдня, і кожны дзень зямля выдавала новых ахвяр нямецкай агрэсіі. Мяркуецца, яны загінулі пры прарыве падчас акружэння на Беластоцкім выступе ў чэрвені—ліпені 1941 года. Пад Слонімам калона савецкіх вайскоўцаў была разбіта нямецкай авіяцыяй. Людзей хавалі ў варонках ад авіябомбаў ці проста па абапал дарог. На нямецкіх здымках ёсць фота калоны падчас тых абстрэлаў. Па іх, дарэчы, і вызначаліся месцы раскопак. Вось ужо некалькі гадоў вядзецца пошук той разгромленай калоны.

— Гэта санітарныя пахаванні, бо яны не выконваліся з пэўнымі патрабаваннямі, — расказвае прадстаўнік батальёна. — Немцы прымушалі гэта рабіць палонных байцоў альбо мясцовых жыхароў. Для такіх мэт часцей за ўсё выбіралі варонкі ад снарадаў ці траншэі па абапал дарог. Часта глыбіня была невялікая.

У першы дзень пошукавай работы на гэтым участку мясцовасці былі вызначаны тры лакацыі для раскопак — каля вёскі Азярніца Слонімскага і Кашалі Зэльвенскага раёнаў. Быў знойдзены першы смяротны медальён. Праўда, з-за дрэннай герметызацыі ўкладыш поўнасцю спарахнеў, і прачытаць запісы на ім не ўдалося.

Па словах **кіраўніка пошукавай групы «Бацькаўшчына» Аляксандра ДУДАРОНКА**, медальёны выклікаюць асаблівыя пачуцці ва ўдзельнікаў экспедыцыі, бо знаходкі могуць вярнуць імя загінулага вайскоўца з небыцця, а гэта значыць, яго імя з'явіцца на памятным мануменце, і, хто ведае, можа, пашанцуе знайсці каго-небудзь з яго нашчадкаў альбо сваякоў. Такія цуды таксама здараюцца.



Падчас раскопак.

Праўда, знайсці тыя капсулы ўдаецца нашмат радзей, чым хацелася б. Вось і пры эксгумацыі 23 байцоў і камандзіраў у Слонімскім раёне было знойдзена толькі чатыры смяротных медальёны. Адзін укладыш адсутнічаў, два запісы пошукавікі змаглі прачытаць. Такім чынам, устаноўлены два прозвішчы з даволі падрабязнай інфармацыяй. Адзін з іх — Кісараў Уладзімір Мікалаевіч, сяржант, 1918 года нараджэння, ураджэнец Яраслаўскай вобласці, Нікіцкага сельсавета, вёскі Пружына. Акрамя медальёна, захаваўся і рэмень з выразанымі на ім ініцыяламі «КВН». Другое прозвішча — Умараў Коныш, чырвонаармеец, 1920 года нараджэння, родам з Узбекскай ССР, Самаркандскай вобласці, Бішкотанскага сельсавета, вёскі Юльдус. У той час тут пражывала і яго сям'я. Цяпер — справа за тым, каб знайсці родных загінулых вайскоўцаў. Таксама будуць аналізавацца і вывучацца выразаныя і выдрапаныя ініцыялы на шрагу асабістых рэчаў і амуніцыі.

### ЖУДАСНЫ ВОДГУК ВАЙНЫ

Пад Слонімам ішлі жорсткія баі. Водгук іх чуваць і цяпер. Прычым у прамым сэнсе гэтага слова. Нядаўна сапёрамі былі знішчаны неўзарваныя нямецкая авіябомба і мінамётная міна. На іх пошукавікі натрапілі каля шашы Слонім — Зэльва падчас правядзення работ. Удзельнікі Вахты Памяці дапамаглі таксама лакалізаваць месца падрыву танка Т-34, рэшткі якога раскапалі каля трасы будаўнікі-дарожнікі.

Па гэтай дарозе за чатыры гады ўдзельнікі Вахты Памяці знайшлі і ўскрылі пяць ям з астанкамі байцоў і камандзіраў, а таксама членаў іх сем'яў і простых бежанцаў. Усе тыя лакацыі, што былі вызначаны па нямецкіх фотаздымках, неслі ў сабе жудасны водгук вайны. Сёлета было вырашана шукаць яшчэ адно месца ў гэтым раёне.

— Летась да нас трапіў яшчэ адзін нямецкі здымак гэтага поля, на якім было відаць яшчэ адно месца пахавання нашых загінулых воінаў, аб чым мы нават не падазравалі, — з горыччу канстатуе Аляксандр Дударонак. — Дапамагла адна дэталь. Гэта былі фрагмент каскі і тыльнік ад вінтоўкі, якія знайшоў на полі ўдзельнік экспедыцыі. І тут мы ўспомнілі, што ў нас ёсць здымак, дзе на ўваткнутую ў зямлю вінтоўку надзета каска. Аказалася, што мы амаль што побач з гэтым месцам расклалі фотаздымкі, а сама лакацыя знаходзіцца там, дзе мы паклалі свае рэчы і заплечнікі. Мы хутка расчысцілі гэта месца і пачалі шукаць сігнал. Затым пусцілі экскаватар. Калі зразумелі, што там нешта ёсць, пачалі працаваць уручную. Там мы знайшлі астанкі дзевяці байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі і два смяротныя медальёны. Але мы не атрымалі ніякай інфармацыі — адзін быў расколаты, а другі спарахнеў. Так і засталіся яны невядомымі салдатамі той вайны.

Кіраўнік пошукавай групы заўважыў, што хутчэй за ўсё там былі пахаваны савецкія вайскоўцы, абпаленыя целы якіх каля абгарэлай тэхнікі сфатаграфавалі нямецкія салдаты. Фотаздымкі дайшлі да пошукавікаў ва ўсёй жорсткай праўдзе тых падзей. А сёлета, больш чым праз 80 гадоў, былі знойдзены астанкі байцоў. Іх чакае годнае перапахаванне.

### «ПЕРАДАЙЦЕ МЕДАЛЬЁН МАЦІ — Я АДЗІН У ЯЕ»

— Мы заўсёды бываем асабліва ўзрушаны, калі ўдаецца вызначыць прозвішча нашых байцоў, — расказвае Аляксандр Дударонак. — Знойдзеныя медальёны адкрываем з заміраннем сэрца. Не заўсёды нашы надзеі апраўдваюцца, бывае, што капсула пашкоджана альбо папера рассыпаецца, але некаторыя надпісы ўдаецца аднавіць. Для нас гэта вельмі істотна.

Так здарылася сёлета падчас раскопак у Свіслацкім раёне, дзе дзякуючы медальёну ўдалося ўстанавіць даныя аднаго з байцоў. Гэта Сяргееў Аляксандр Міхайлавіч, чырвонаармеец, 1921 года нараджэння, ураджэнец Ленінграда, мабілізаваны Кастрычніцкім РВК. Пазначана таксама Ганна Аляксандраўна Сяргеева, але хто яна, канкрэтна не ўказана. У другім месцы разам з астанкамі байцоў і камандзіраў, якія загінулі на тэрыторыі раёна, былі знойдзены тры медальёны і кубак з выдрапаным на ім надпісам «Тапалеўскі, 1941 год». Устаноўлена, што поўнае імя гаспадара кубка — Пётр Іванавіч Тапалеўскі, 1919 года нараджэння, ён ураджэнец сяла Грыгор'еўка, цяпер Херсонскай вобласці. Загінуў у чэрвені 1941 года. Родных загінулых байцоў будуць шукаць валанцёры і самі ўдзельнікі экспедыцыі.

Разам з астанкамі шасці чалавек пад вёскай Азярніца Слонімскага раёна знойдзены добра захаваны ўкладыш, які належаў Рудаманаву Ільі Васільевічу, 1920 года нараджэння, ураджэнцу Пяцігорска, Гарачаводскага сельсавета, калгаса «Чырвоны Партызан». Удалося знайсці медальён з укладышам на імя Атажанава Пірмата, чырвонаармейца 1915 года нараджэння з Джалала-бадскай вобласці Кіргізіі. Іх імёны таксама будуць увекавечаны для нашчадкаў.

Дарэчы, з раскопкамі пад Азярніцай звязана адна вельмі шчымлівая гісторыя. У яме на 11 чалавек у аднаго з байцоў знайшлі заціснуты ў кулаку смяротны медальён. Аляксандр Дударонак адразу ўспомніў колішні расказ мясцовай жыхаркі Антаніны Ефімовіч, якая на пачатку вайны пасля пажару на хутары разам з іншымі жыхарамі пайшла ў Азярніцу. Немцы прынялі іх за бежанцаў і сем'і камандзіраў і пагналі расстрэльваць да царквы. Яны ўжо стаялі паабапал той ямы, калі настаяцель храма сказаў нямецкаму афіцэру, што гэта мясцовыя жыхары. Па словах жанчыны, іх тады адпусцілі. Але яна была сведкай, як да ямы немцы неслі цяжка параненага маладога байца. Ён працягваў да жыхароў руку, у якой трымаў смяротны медальён, і прасіў, каб перадалі яго маці, бо ён у яе адзіны сын. Немец, які стаяў побач, стукнуў байца прыкладам і жывога кінуў у яму. На жаль, укладыш з таго заціснутага ў руцэ медальёна не захаваўся.



Пахаванне савецкіх ваеннаслужачых у сучасным Слонімскім раёне (нямецкі архіўны фотаздымак).

За некалькі метраў ад той ямы знайшлі яшчэ адзін магільнік, пераважна з астанкамі грамадзянскіх асоб і двух ваеннаслужачых. На краю ямы знаходзіліся рэшткі камандзірскіх скураных ботаў, брытва і некалькі скручаных салдацкіх рамянёў. Відаць, перад расстрэлам ахвярам загадалі скласці рэчы асобна.

— Мы планавалі абследаваць чатыры лакацыі, якія зафіксаваны на нямецкіх фотаздымках, адпрацавалі дзве з іх — і там быў вынік, — робіць выснову кіраўнік пошукавай групы «Бацькаўшчына». — Думаю, што вернемся туды ў наступным годзе. Мой дзед нездарма казаў, што каля царквы была яшчэ яма на 40 чалавек. Магчыма, знойдзем і новыя, невядомыя месцы пахавання расстраляных каля царквы ваеннапалонных і бежанцаў.

### УВЕКАВЕЧЫЦЬ ПАМЯЦЬ АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ

Чарговы этап акцыі «Беларусь памятае: эстафета Памяці» праходзіў на Гродзеншчыне з 30 ліпеня да 7 жніўня і быў прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На тэрыторыі Свіслацкага і Зэльвенскага раёнаў выяўлена па два новых месцы пахавання, у Слонімскім — чатыры. Усяго з ям-магіл эксгумавана 70 астанкаў, якія перададзены мясцовым органам улады для далейшага перапахавання. Мяркуецца, што такое мерапрыемства пройдзе ў кожным з раёнаў у верасні і будзе прымеркавана да Дня народнага адзінства.

Аб тым, як сёлета вядзецца пошук у цэлым па краіне, расказаў намеснік камандзіра 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Аляксандр Крэмянеўскі. Ён паведаміў, што на 2024 год запланавана адпрацаваць 123 аб'екты. Яшчэ 35 уключана дадаткова па хадайніцтве Генеральнай пракуратуры, мясцовых органаў улады, а таксама па зваротах грамадзян. Работы праводзяцца з канца сакавіка сіламі шасці спецыялізаваных пошукавых падраздзяленняў на тэрыторыі Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей.

На дадзены перыяд па факце генацыду адпрацавана 14 аб'ектаў. Устаноўлена 13 невядомых да гэтага часу месцаў пахавання, эксгумаваны астанкі 842 мірных жыхароў. Пошук воінскіх пахаванняў запланаваны на 133 аб'ектах. Разам з асабовым складам 52-га пошукавага батальёна ў акцыі прымаюць удзел 13 рэгіянальных грамадскіх арганізацый, пошукавыя клубы і атрады Беларусі, Расіі і Казахстана.

На цяперашні момант пошукавыя работы поўнасцю завершаны на 102 аб'ектах. Знойдзены 462 вайскоўцы, якія загінулі ў перыяд з 1941 да 1944 года. 17 імёнаў удалося ўстанавіць. І гэта, бадай, галоўная місія пошукавай справы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**Фота з архіва 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна і пошукавай групы «Бацькаўшчына».**